**Міхно, М.** Смелага куля баіцца… / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2009. — 1 жн. — С. 5.

## СМЕЛАГА КУЛЯ БАІЦЦА…

Не пахожы Міхаіл Касцянка на тых «афганцаў», пра якіх кажуць, што гэтыя людзі неўраўнаважаныя, з агаленымі нервамі і пачуццямі, часта не знайшоўшыя сябе ў сучаснасці. Не падобны. Наадварот, пры сустрэчы з гэтым рухавым, энергічным чалавекам узнікаюць зусім іншыя пачуцці. Адчуваеш добрую зайздрасць да яго. Прайшоў праз вайну. Смела, не хаваючыся за спіны чужыя, бо служыў разведчыкам і ўсе два гады быў на перадавой, але выйшаў з той мясарубкі без драпіны. Вось ужо сапраўды – смелага куля баіцца. І ў мірным жыцці Міхаіл заўсёды спрабаваў ухапіць быка за рогі. І часта гэта яму ўдавалася. Бог любіць счасліўчыкаў!

Зрэшты, у жыцці Міхаілу шанцавала не кожны раз. На чужую вайну ў мірны час адпраўлялі далёка не ўсіх яго равеснікаў. А Касцянку адправілі. Вайна, калі хочаце ведаць, таксама выбірае лепшых. Міша быў хлопцам рослым, з чацвёртага класа (а вучыўся ён у першай чашніцкай школе) гуляў у баскетбол. Падлетак шустры, падчас і задзірысты, але равеснікі яго паважалі, бо хлопец мог пастаяць за сяброў. Гэтыя якасці як нельга дарэчы прыйшліся яму ў Афганістане. Хлопцу, які ўмее пастаяць за сябе, лягчэй жывецца, асабліва, калі ён, як наш герой, выхадзец з «пралетарскай», да таго ж мнагадзетнай сям'і, якая не купаецца ў раскошы, дзе кожны ў жыцці прабівае сабе дарогу сам.

У армію прызвалі, калі Міша ўжо атрымаў прафесію газаэлектразваршчыка, скончыўшы прафтэхвучылішча ў Жодзіне. Ноч, праведзеная на перасылачным пункце ў Мар'інай Горцы, і – Тэрмез. Радавога Касцянку залічваюць у роту снайпераў, дзе ён праслужыў два з паловай гады, пакуль аднойчы на верталёце не закінулі іх у Кундуз. Так Міхаіл Касцянка апынуўся ў самым пекле афганскай вайны. Ён трапіў у трэцюю разведвальна-дэсантную роту асобнага разведвальнага батальёна Гатчынскай дывізіі. І пайшлі суровыя будні. Шэрыя, як запыленыя салдацкія боты, салёныя, як ручайкі поту пад мокрай гімнасцёркаю, бязлітасныя і гарачыя, як сонца ў гарах ля Кундуза. Спачатку Міхаіл быў у рамонтным узводзе, але неўзабаве стаў разведчыкам. Цяпер ён не расставаўся са сваёю баявой машынай – «БРМкаю». На заданні выходзілі, як правіла, уначы, а днём адпачывалі. Не пералічыць усіх тых аперацый, у якіх паўдзельнічаў за два гады у Афганістане механік-вадзіцель дэсантна-разведвальнай роты Міхаіл Касцянка. Можна назваць толькі тры буйнейшыя з іх. Гэта мармольская, фанзабадская і пандшэрская. Асабліва вялікія страты панесла іх рота пад час апошняй з гэтых аперацый, трэцяга мая 1984 года. Міхаіл назаўсёды запомніў чорны дзень у сваім афганскім календары, які забраў адразу некалькіх яго баявых таварышаў. Занялі «высотку», выканалі пастаўленае перад імі заданне, вярталіся ў распалажэнне, калі раптам напароліся на засаду. Іх расстрэльвалі ва ўпор, не даўшы апамятацца і заняць выратавальныя пазіцыі. На месцы забіла ўзводнага, авіянаводчыка, загінулі сябры Каштуеў, Падкарытаў, з якімі разам ішлі па вайне. Стралялі снайперы прыцэльна, бо хлопцы падалі забітымі на месцы. А да «дэмбеля» было так блізка... Зрэшты, на той час Міхаіл ужо быў «дэмбелем», ён пераслужваў свой абавязковы тэрмін, тады гэта было звычайнай практыкай. Праз месяц вернецца дадому з афганскага пекла, вернецца, каб назаўсёды ў памяці захаваць вобразы жывых (Ігара з Магілёва, Валодзі з-пад Мінска) і мёртвых баявых сяброў. Вернецца, каб распавесці

маладзейшым пра тое, што такое вайна. Зрэшты, яны, «афганцы», распавядаюць неахвотна. Іх можна зразумець, бо не кожкы чалавек стане «пахваляцца» вайною. Ды й не прывыклі яны скардзіцца, не з тых людзей. Ён вернецца, каб даказаць, найперш самому сабе, што фартуна любіць моцных, а дарогу адужае толькі той, хто ідзе.

Але нялёгкім акажацца той шлях былога воіна-«афганца» да сябе. Два інстытуты – Магілёўскі педагагічны і Гомельскі кааператыўны. І абодва... няскончаныя. Затое дзве дачкі, якія, напэўна ж, спраўдзяць бацькаву мару пра вышэйшую адукацыю. Старэйшая, Наталля, – ужо студэнтка, а ў малодшай, Елізаветы, яшчэ ўсё наперадзе. І жонка-настаўніца, якая не пабаялася звязаць свой лёс з разведчыкам. І дзеляць гэтае шчасце Ірына з Міхаілам вось ужо амаль чвэрць стагоддзя. Разведчыкі, як, зрэшты, і настаўнікі, ніколі не бываюць былымі. І вось ужо Міхаіл Сямёнавіч разведвае новыя сферы дзейнасці – прадпрымальніцтва, будаўніцтва. Зараз ён працуе брыгадзірам у будаўнічай фірме «Прынвест». Як бачым, гэты чалавек добра асвоіўся ў сучасных умовах, але ён ніколі ў думках не расстаецца са сваім прапахшым порахам юнацтвам.

**У. Міхно**